**<u>Пра курс ад настаўніцы:</u>**

## “Мама Тэматыка”

З матэматыкай дзеці сутыкаюцца з самага ранняга дзяцінства практычна кожны дзень, і, нават, не заўважаюць гэтага. Дзеці ад прыроды цікаўныя. Яны жадаюць даследаваць і здзяйсняць свае маленькія адкрыцці. Мая задача - падтрымаць гэтыя імкненні.

Адной з умоў больш лёгкага засваення матэматычных ведаў ў школе з’яўляецца развіццё з ранняга дзяцінства цікавасці да матэматыкі. Сучасная школьная праграма вельмі насычаная і далёка не простая нават для першаклашкі. Цікавасць да прадмету і наяўнасць базавых ведаў дапамогуць пераадолець гэтыя цяжкасці.

Падчас заняткаў мы будзем знаёміцца з геаметрычнымі фігурамі, з прасторавымі паняццямі размяшчэння прадметаў (наперадзе, ззаду, злева, справа). Будзем вучыцца параўноваць прадметы па розных прыкметах, класіфікаваць і падзяляць на групы. Канешне, будзем знаёміцца з лікамі ды лічбамі, з іх паслядоўнасцю і складам і шмат чаго яшчэ цікавага будзем рабіць!

Маленькія дзеці значна лепш засвойваюць эмацыйна ўспрыняты матэрыял. Таму на занятках буду выкарыстоўваць гульні, лічылкі, вершыкі. Заданні будуць мець практычны накірунак.

На маю думку, цікавыя заняткі матэматыкай такія, якія доўжыцца нядоўга, захапляюць, раскрываюць новыя веды лёгка і нязмушана. Яны не напружваюць дзяцей, а, наадварот, расслабляюць і нараджаюць пачуццё радасці ад сустрэчы з новымі ведамі.

А я чакаю радасці ад сустрэчы са сваімі новымі вучнямі і іх бацькамі.

**<u>Пра настаўніцу:</u>**

- Вышэйшая адукацыя.
- Педагагічны стаж больш за 30 гадоў.
- Мае прафесійную катэгорыю настаўнік-метадыст і выхавацель вышэйшай катэгорыі.
- Працавала настаўніцай пачатковых класаў, настаўніцай беларускай мовы і літаратуры, метадыстам, старэйшым выкладчыкам у Інстытуце Развіцця Адукацыі, намеснікам дырэктара школы.
- З’яўляецца аўтарам больш за 40 друкаваных дапаможнікаў для вучняў пачатковых класаў.